## ДАСЛЕДАВАННЕ АРХІТЭКТУРЫ І СЦЭНАГРАФІІ БЕЛАРУСКАГА ТЭАТРА: КАМПАРАТЫЎНЫ ПАДЫХОД

*ПагоцкаяА.В.*

Стан замежнага і айчыннага мастацтвазнаўства ў пачатку XXI стагоддзя характарызуецца ўзрастаючай увагай да праблем нацыянальнага мастацтва. У апошні час відавочнай становіцца неабходнасць вывучэння мастацкай куль- туры як асаблівай сістэмы, якая звязана з арганізацыяй мастацкай дзейнасці, з стварэннем мастацкіх каштоўнасцей, іх захаваннем і распаўсюджваннем. Увага да сваёй культурнай спадчыны спрыяе працэсу разумения мастацтва мінулых часоў здабыткаў нацыянальнай культуры. Вывучэнне заканамер- насцей змены стыляў і логікі руху мастацтва дае магчымасць зразумець яго развіццё і ацаніць сённяшні стан з улікам дасягненняў мінулых эпох, што дае падставы для вызначэння перспектыў развіцця мастацтва.

На сучасным этапе развіцця беларускай дзяржаўнасці надзвычай важ- ным і актуальным становіцца ўсебаковае і глыбіннае вывучэнне беларускай гісторыі і культуры. Ад паспяховасці гэтага працэсу залежыць захаванне і асэнсаванне ўласных духоўных каштоўнасцей, сцвярджэнне нацыянальнай свядомасці і асэнсаванне месца рэспублікі ў агульнаеўрапейскай супольнасці.

За апошнія дзесяцігоддзі беларускаму тэатру, яго гісторыі аддала на- лежную ўвагу вялікая колькасць аўтараў. Айчынная мастацтвазнаўчая школа выпрацавала прынцыпы гістарызму і кампаратывізму, якія ўключаюць у сябе вывучэнне гісторыі нацыянальнага беларускага тэатра і выяўленчага мастацтва, а таксама іх сувязь з агульнаеўрапейскай культурай. У якасці метадалагічных прынцыпаў і рэгулятыўных палажэнняў прымяняюцца асноўныя навуковыя палажэнні рускіх і беларускіх вучоных, гісторыкаў, даследчыкаў архітэктуры, тэатразнаўцаў Г.І. Барышава, Г.Б. Бархіна, В.І. Бярозкіна, Т. В. Габрусь, В.У. Дадзіёмавай, Э.К. Дарашэвіча, У М. Дзянісава, П.А. Карнача, У М. Конана, А. М. Кулагіна, А.І. Мальдзіса, А. В. Сабалеўскага, Л.А. Сафронавай, В.А. Чантурыя і інш.

З часоў з'яўлення кінематографа тэатр пастаянна знаходзіЦца пад па- грозай знікнення. Каб выжыць, яму неабходна шукаць новыя шляхі вы- карыстання сваіх унікальных якасцей — як праз уважлівае вывучэнне мінулых форм, так і праз імкненне ісці насустрач запытам сучаснасці. Су- часная аудыторыя прызвычаілася да самых розных стыляў пастаноўкі: ад класічнага да сярэднявечнага — з аднаго боку, і да пазнейшых сцэнічных эксперыментаў — з другога. Змены ў сусветным тэатры XX стагоддзя былі звязаны з пошукамі ў галіне драматургіі і рэжысуры (Б. Брэхт, П. Брук, Е.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гратоўскі, Ж. Капо) і сцэнаграфіі (А. Апіа, Э.Г. Крэг, Ё. Свобада). У апошні час значэнне візуальнага вобраза спектакля значна расце, пра што свед- чыць і тэатральная практыка, і тэарэтычныя канцэпцыі драматургаў і рэжысёраў. Сучасная тэатральная практыка патрабуе тэарэтычнага ас- мыслення тэатральнага мастацтва, архітэктуры і сцэнаграфіі па зусім новых прынцыпах. Актуальным стала даследаванне пытанняў узнікнення і развіцця тэатральных памяшканняў, адпаведнага ім афармлення, прынцыпаў арганізацыі тэатральнай прасторы.

Беларускітэатрразвіваўсяўцеснымкантакцезтрадыцыйнымітэатрамі заходне- і ўсходнееўрапейскіх народаў, запазычваў у іх формы, метады, якія былі яму блізкімі па духу, і, у сваю чаргу, аказваў уплыў на іх тэатраль- ную культуру. Правядзенне параўнальнай характарыстыкі тэатральных збудаванняў і элементаў сцэнаграфіі з выяўленнем іх генетычных каранёў дазваляе паказаць беларускую тэатральную творчасць як частку сусвет- най тэатральнай культуры і вызначыць яе самабытныя рысы.

У пачатку XXI стагоддзя вызначаецца неабходнасць гісторыка-культурнай і мастацка-эстэтычнай ацэнкі стылявых з'яў у развіцці народнай і прафесійнай тэатральнай культуры Беларусі, яе сувязяў з агульнаеўрапейскай культурай і месца ў ёй. Выяўленне асаблівасцяў беларускага тэатральнага мастацтва з'яўляецца важным ў рэчышчы сучаснага працэсу яднання славянскіх народаў і інтэграцыі ў агульнаеўрапейскую культурную прастору.

Неабходнасць вывучэння архітэктуры і сцэнаграфіі беларускага тэатра абумоўлена патрэбнасцю сучаснага кампаратыўнага падыходу, які прадуглед- жвае асэнсаванне ролі тэатральнай архітэктуры і сцэнаграфіі ў стварэнні ма- стацкага вобраза спектакля на розных этапах існавання беларускага тэатра.

Тэатральнае мастацтва канца XVI — пачатку XX стагоддзя праяўляецца ў архітэктуры і сцэнаграфіі ў рэчышчы пануючых мастацкіх стыляў (барока і ракако, класіцызм, мадэрн). Кампаратыўны падыход дазваляе разглядаць і вывучаць усе больш-менш значныя этапы, з'явы, імёны сусветнага тэатра (іх апісанне, сістэматызацыю, тлумачэнне), кампазіцыйныя і формастваральныя элементы тэатральных збудаванняў і сцэнаграфіі, іх стваральнікаў працэс канвергенцыі з заходнееўрапейскім і расійскім тэатральным мастацтвам.

Кампаратывізм спрыяе пашырэннютэарэтыка-метадалагічнай базы мастацтвазнаўства і тэатразнаўства, паколькі можа прымяняцца пры вывучэнні праблем сцэнаграфіі, драматургіі спектакляў, а таксама пытанняў успрымання, разумения і інтэрпрэтацыі твораў тэатральнага мастацтва. Пры такім падыходзе збудаванні і сцэнаграфія беларускага тэатра разглядаюцца ў адзіным кантэксце з архітэктурай і сцэнаграфіяй заходнееўрапейскага і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рускага тэатра і прадстаўлены адзіным цэлым у прасторы сусветнай тэатральнай культуры.

На беларускім матэрыяле можа праводзіцца сістэмнае даследаванне і раскрыццё спецыфікі твораў тэатральнай архітэктуры і сцэнаграфіі, прычым гэты працэс — самабытная гісторыка-культурная з'ява ў агульнаеўрапейскім кантэксце. Да таго ж, кампаратывізм дазваляе выявіць агульныя заканамернасці ўзнікнення і бытавання тэатральных збудаванняў і сцэнаграфіі, а таксама рысы іх рэгіянальнай своеасаблівасці і самабытнасці.

Такім чынам, кампаратыўны падыход можа выкарыстоўвацца пры даследаванні пытанняў тэорыі і гісторыі беларускага мастацтва, у педагагічным працэсе, у музейнай практыцы, у сферы турызму. Апісанне архітэктурных каштоўнасцей Беларусі ў рэкламных матэрыялах, буклетах можа абумовіць эканамічную значнасцьдаследаванняўякая можа прыўзняць турыстычную прывабнасць краіны і прыцягнуць замежныя інвестыцыі. Навуковыя палажэнпі і вывады, метадалагічныя прынцыпы даследаванняў становяцца асновай для далейшых навуковых пошукаў у гісторыі і тэорыі мастацкай культуры Беларусі. Кампаратыўны падыход можа выкарыстоўвацца пры распрацоўцы вучэбных курсаў гуманітарнага профілю (гісторыя і тэорыя мастацкай культуры, гісторыя тэатральнага, тэатральна-дэкарацыйнага мастацтва і архітэктуры, гісторыя беларускага тэатра і т.д.), пры стварэнні вучэбных дапаможнікаў і метадычных матэрыялаў. Сацыяльна-эканамічная значнасць даследаванпяў вызначаецца накіраванасцю на паляпшэнне эфектыўнасці мастацтвазнаўчай і тэатразнаўчай адукацыі ў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ